Назаранка, А.М. Дысертацыі па гістарыяграфіі, крыніцазнаўстве і метадах гістарычнага даследавання, музеязнаўстве, кансервацыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурных аб’ектаў, абароненыя ў Беларусі / А.М. Назаранка // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныядысцыпліны: навук. зб. Вып. 9 / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн.: БДУ, 2014. – с. 263 – 268.

# ДЫСЕРТАЦЫІ ПА ГІСТАРЫЯГРАФІІ, КРЫНІЦАЗНАЎСТВЕ І МЕТАДАХ ГІСТАРЫЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ, МУЗЕЯЗНАЎСТВЕ, КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ АБ’ЕКТАЎ, АБАРОНЕНЫЯ Ў БЕЛАРУСІ

За перыяд з кастрычніка 2012 г. па верасень 2013 г. у Беларусі былі абаронены адна доктарская і тры кандыдацкія дысертацыі (па спецыяльнасці 07.00.09 — Гісторыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання).

Дысертацыйныя даследаванні па спецыяльнасці 05.25.02 «Дакументалістыка, дакументазнаўства, архівазнаўства» ў разглядаемы перыяд не абараняліся. У гэтай сувязі варта адзначыць, што ў 2013/14 навучальным годзе навучанне ў аспірантуры БДУ па спецыяльнасці 05.25.02 завяршае адразу некалькі маладых даследчыкаў, што дазваляе спадзявацца на аднаўленне абарон дысертацый па архівазнаўстве і дакументазнаўстве. Сітуацыя па падрыхтоўцы навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў названых галінах не спрашчаецца, аднак, адсутнасцю спецыялізаванага савета па абароне дысертацый па дакументалістыцы, дакументазнаўстве, архівазнаўстве. Узгадваючы ўведзеную ў маі 2012 г. ВАК Беларусі магчымасць прысуджэння ступені па юрыдычных навуках па спецыяльнасці 05.25.02 (гл. папярэдні выпуск зборніка), варта адзначыць, што за прайшоўшыя з моманту рашэння паўтара гады ВАК не зацвярджаў ні абноўлены пашпарт спецыяльнасці, ні праграмы-мінімум па названай спецыяльнасці.

Навуковае кіраўніцтва (кансультаванне) абароненымі дысертацыямі забяспечвалася супрацоўнікамі БДУ, БДПУ імя Максіма Танка, Інсты-

тута гісторыі НАН Беларусі (ІГ НАНБ); апанентамі выступілі навукоўцы з БДУ, БДПУ імя Максіма Танка, ІГ НАНБ, ГрДУ імя Янкі Купалы, ВДУ імя П. М. Машэрава і Акадэміі МУС Беларусі. Апаніруючымі арганізацыямі былі МДУ імя А. А. Куляшова, БДПУ імя Максіма Танка, ГрДУ імя Янкі Купалы. Дзве дысертацыі абаронены ў савеце пры БДУ, па адной — у БДПУ імя Максіма Танка і ІГ НАНБ.

**Здановіч Уладзімір Васільевіч.** Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945) у адлюстраванні айчыннай гістарыяграфіі / англ. — Belarus during the Years of the Great Patriotic War (1941—1945) in the Reflection of Home Historiography.

***Навуковы кансультант*:** доктар гіст. навук, прафесар А. А. Каваленя.

*Даты абароны і зацвярджэння ў ВАК*: 30.01.2013; н/д.

*Мэта даследавання*: абапіраючыся на дасягненні папярэдніх даследчыкаў, на падставе ўсебаковага і грунтоўнага гістарыяграфічнага аналізу прац, у якіх непасрэдна ці ўскосна разглядаюцца розныя пытанні і аспекты гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг., вызначыць ступень вывучанасці праблемы, акрэсліць далейшыя нкірункі даследаванняў.

*Асноўныя вынікі, навізна працы*: праведзены комплексны гістарыяграфічны аналіз разнастайных крыніц і паказаны ўклад айчынных гісторыкаў у вывучэнне праблемы. Выяўлены заканамернасці і асаблівасці фарміравання і развіцця навукова-даследчых прац па тэме, пачынаючы з 1941 г., прапанаваны аўтарскі варыянт перыядызацыі гістарыяграфіі даследаванняў Вялікай Айчыннай вайны.

**Урублеўскі Юрый Уладзіміравіч.** Гістарыяграфія гісторыі ўзнікнення і развіцця гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў IX—XIII стст. / англ. — The historiography of the history of emergance and development of the cities on the territory of Belarus in IX—XIII centuries.

***Навуковы кіраўнік*:** доктар гіст. навук, прафесар А. М. Люты.

*Даты абароны і зацвярджэння ў ВАК*: 15.02.2013; 05.06.2013.

*Мэта даследавання*: распрацоўка гістарыяграфічнай канцэпцыі гісторыі ўзнікнення і развіцця гарадоў на тэрыторыі Беларусі ў IX—XIII стст.

*Асноўныя вынікі, навізна працы*: на падставе вывучэння гістарыяграфічных крыніц вызначаны тэарэтычныя асновы і тэндэнцыі даследаванняў раннесярэднявечных гарадоў Беларусі, прааналізаваны ўклад расійскіх і айчынных навукоўцаў у вывучэнне працэсу ўзнікнення старажытных гарадоў Беларусі, раскрыта спецыфіка ўяўленняў археолагаў

па праблеме «пераносу» гарадоў, выяўлены спецыфічныя рысы і заканамернасці працэсу развіцця поглядаў у галіне гістарычнай тапаграфіі раннесярэднявечных гарадоў на беларускіх землях. Выфашана праблема распрацоўкі гістарыяграфічнай канцэпцыі гісторыі ўзнікнення і развіцця гарадоў у IX—XIII стст. на тэрыторыі Беларусі.

**Саковіч Кацярына Георгіеўна.** Англамоўная гістарыяграфія савецкай знешняй палітыкі сярэдзіны 1950-х — сярэдзіны 1960-х гг. / англ. — English-speaking historiography of Soviet Foreign Policy of the middle 1950s — the middle 1960s.

***Навуковы кіраўнік*:** доктар гіст. навук, прафесар В. І. Менькоўскі.

*Даты абароны і зацвярджэння ў ВАК*: 06.06.2013; н/д.

*Мэта даследавання*: раскрыццё дынамікі і зместу англамоўнай гістарыяграфіі савецкай знешняй палітыкі сярэдзіны 1950-х — сярэдзіны 1960-х гг.

*Асноўныя вынікі, навізна працы*: упершыню ў айчыннай і іншамоўнай гістарыяграфіі праведзена комплекснае даследаванне англамоўнай гістарыяграфіі савецкай знешняй палітыкі сярэдзіны 1950-х — сярэдзіны 1960-х гг., разгледжана і растлумачана яе эвалюцыя, вызначаны тэарэтыка-метадалагічныя, канцэптуальныя і палітычныя дамінанты.

**Максімчык Андрэй Мікалаевіч.** Далучэнне Паўночнага Каўказа да Расіі ў гістарыяграфіі XIX — пачатку XXI ст. / англ. — Joining the North Caucasus to Russia in the historiography XIX — the beginning of the XXI century.

***Навуковы кіраўнік*:** кандыдат гіст. навук, прафесар А. А. Яноўскі.

*Даты абароны і зацвярджэння ў ВАК*: 06.06.2013; н/д.

*Мэта даследавання*: выяўленне тэндэнцый і арыенціраў у вывучэнні, інтэрпрэтацыі часу, прычын, характару і наступстваў далучэння Паўночнага Каўказа да Расіі, што павінна дазволіць прадставіць цэласную карціну навуковага асэнсавання гэтага складанага і доўгатэрміновага палітычнага працэсу.

*Асноўныя вынікі, навізна працы*: даецца сістэмнае прадстаўленне розных этапаў у вывучэнні гісторыі расійска-каўказскіх адносін XVI—XIX стст. і навуковым асэнсаванні гісторыі далучэння Паўночнага Каўказа да Расіі ў XIX — пачатку XXI ст. Упершыню прааналізаваны канцэптуальныя падыходы розных аўтараў па найважнейшых аспектах праблемы (вызначэнне часу і характару далучэння, ацэнкі яго прычын і наступстваў) у максімальна магчымых часовых рамках.

* * *

Па спецыяльнасці 24.00.03 «Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў» за два гады з 2010 г. было абаронена тры дысертацыі на суісканне ступені кандыдата культуралогіі. Навуковае кіраўніцтва абароненымі дысертацыямі забяспечвалася супрацоўнікамі БДУК; апанентамі выступілі навукоўцы з БДУ, БрДУ імя А. С. Пушкіна, Полацкага музея-запаведніка. Апаніруючай арганізацыяй выступаў ГрДУ імя Янкі Купалы. Дысертацыі абаронены ў савеце пры БДУК.

**Джумантаева Тамара Аляксандраўна.** Музеефікацыя культурнай прасторы Полацка: традыцыі і навацыі / англ. — Museefication of the Polatsk Cultural Space: Traditions and Innovations.

***Навуковы кіраўнік*:** доктар культуралогіі, прафесар А. І. Смолік.

*Даты абароны і зацвярджэння ў ВАК*: 07.04.2011; 12.10.2011.

*Мэта даследавання*: вызначыць сутнасць, дэтэрмінанты, традыцыі і інавацыі музеефікацыі аб'ектаў культурнай прасторы Полацка.

*Асноўныя вынікі, навізна працы*: упершыню ў беларускай культуралогіі на прыкладзе Полацка даследуюцца такія паняцці, як феномен гарадскога музея, музей як культурны кампанент культурнай прасторы, музеефікацыя культурна-гістарычнай часткі горада, узнікненне музейнага асяроддзя ў гарадской прасторы, яго роля ў грамадстве і фарміраванні прафесіі музейнага супрацоўніка. У дысертацыі падрабязна апісваецца работа музея-запаведніка як інавацыйнай формы музея і вызначаецца яго роля ў працэсе музеефікацыі ўнікальнай гістарычнай тэрыторыі і захаванні гісторыка-культурнай спадчыны.

**Краснова Яўгенія Леанідаўна.** Сучасная экспазіцыйная прастора музеяў Беларусі: камунікатыўны аспект / англ. — Museefication of the Polatsk Cultural Space: Traditions and Innovations.

***Навуковы кіраўнік*:** доктар гіст. навук, прафесар М. А. Бяспалая.

*Даты абароны і зацвярджэння ў ВАК*: 31.05.2012; 31.10.2012.

*Мэта даследавання*: выяўленне, раскрыццё і трансляцыя патэнцыяльных камунікатыўных магчымасцей сучаснай экспазіцыйнай прасторы музеяў Беларусі.

*Асноўныя вынікі, навізна працы*: вылучаны і ахарактарызаваны гістарычныя этапы фарміравання экспазіцыйнай прасторы музеяў Беларусі, распрацавана аўтарскае вызначэнне паняцця «музейная экспазіцыя» ў кантэксце тэорыі музейнай камунікацыі. Выяўлены камунікацыйны

патэнцыял экспазіцыйнага асяроддзя беларускіх музеяў і раскрыта значэнне структурнага зместу і функцый экспазіцыі, апошнія з якіх падзелены на агульныя і адмысловыя. Паказана неабходнасць пошуку аптымальных суадносін мастацка-дэкаратыўнага афармлення і экспазіцыйных матэрыялаў пры арганізацыі прасторы музейнай экспазіцыі, прапанавана паняцце «музейная інсталяцыя». Вызначаны сучасныя тэндэнцыі ў арганізацыі музейнага асяроддзя, якія здольны павялічыць аго камунікатыўны патэнцыял.

**Лупашка Ірына Генадзьеўна.** Функцыянаванне беларускіх літаратурных музеяў у кантэксце сучасных сацыякультурных працэсаў / англ. — Belarusian Literature Museums in Modern Socio-Cultural Environment.

***Навуковы кіраўнік*:** доктар гіст. навук, прафесар М. А. Бяспалая.

*Даты абароны і зацвярджэння ў ВАК*: 30.05.2013; н/д.

*Мэта даследавання:* выяўленне асноўных заканамернасцей, спецыфікі і тэндэнцый развіцця літаратурных музеяў у кантэксце сацыякультурных працэсаў.

*Асноўныя вынікі, навізна працы*: упершыню абагульнены вопыт развіцця беларускіх літаратурных музеяў у кантэксце сацыякультурных працэсаў і вылучаны асноўныя этапы фарміравання сеткі літаратурных музеяў Беларусі. Адлюстравана поліфункцыянальная дзейнасць беларускіх літаратурных музеяў, іх роля як сацыякультурных інстытутаў. Прапанавана аўтарскае вызначэнне і класіфікацыя літаратурных музеяў. Вылучаны тэндэнцыі развіцця літаратурных музеяў Беларусі.

* * *

У дадатак да звестак папярэдняга сборніка трэба адзначыць зацвярджэнне 19 верасня 2012 г. ВАК Беларусі рашэння па дысертацыі Г. Г. Паўлоўскай «Гродзенскія кляштарныя хронікі як крыніца па гісторыі Гродна другой паловы XVII—XVIII стст.».

Можна адзначыць паспяховую абарону дысертацыі 24 студзеня 2013 г. у савеце пры БДУ і прысуджэнне ступені кандыдата гістарычных навук аднаму з аўтараў нашага зборніка — А. В. Бурачонку (тэма — «Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводскай вытворчасці Беларусі (1861—1914 гг.)», спецыяльнасць 07.00.02, *навуковы кіраўнік* канд. гіст. навук, дацэнт А. Г. Каханоўскі; зацверджана ВАК 10.04.2013).

Пэўную цікавасць можа ўяўляць абароненая 27 снежня 2012 г. у Кемераўскім дзяржаўным універсітэце кандыдацкая дысертацыя **Васіля**

**Міхайлавіча Віўчара** «Феномен Берасцейскай грэка-каталіцкай уніі ў асвятленні айчыннай гістарыяграфіі другой паловы XIX — пачатку XX ст.». Работа па спецыяльнасці 07.00.09 была выканана ў Омскім дзяржаўным універсітэце імя Ф. М. Дастаеўскага пад навуковым кіраўніцтвам прафесара Г. К. Садратдзінава і дацэнта А. В. Хракава. У дысертацыі прапанавана рэканструкцыя навуковай канцэпцыі Берасцейскай грэка-каталіцкай уніі, якая склалася ў дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі.

8 кастрычніка 2013 г. дысертацыю на суісканне ступені доктара гістарычных навук у савеце пры Санкт-Пецярбургскім інстытуце гісторыі РАН на тэму «Праблемы верацярпімасці ў Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі (1863—1914 гг.)» абараніў па спецыяльнасці 07.00.02 дацэнт кафедры багаслоўя Інстытута тэалогіі БДУ **Аляксандр Юр'евіч Бендзін**. Мэтай дысертацыйнага даследавання было ўсебакова прааналізаваць эвалюцыю і змест праблем верацярпімасці, існаваўшых у Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі ў 1863—1914 гг., выявіць канфлікты і супярэчнасці, абумовіўшыя іх з'яўленне, разгледзець матывы і паводзіны канфліктуючых бакоў, паказаць спробы вырашэння рэгіянальных праблем на агульнарасійскім і знешнепалітычным узроўні. Кансультантам выступіў акадэмік РАН Барыс Васільевіч Ананьіч. Апанентамі выступілі дактары гістарычных навук Л. У. Выскачкаў, Н. С. Андрэева, доктар юрыдычных навук А. А. Сафонаў.

* * *

Віншуем усіх суіскальнікаў і іх навуковых кіраўнікоў з паспяховымі абаронамі, жадаем далейшых творчых вынікаў і спадзяемся на плённае супрацоўніцтва.

**А. М. Назаранка,** старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта